# Ідуць экзамены! Студэнты БДУ, парадуем Радзіму высокімі ведамі!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 20 (529) Субота, 8 чэрвеня 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы

# НІ ПУХУ, НІ ПЯРА!

*Экзаменацыйны агляд*

Цікавая дэталь: экзамены ідуць поўным ходам, атрыманы першыя пяцёркі, чацвёркі, тройкі і, на жаль, нават двойкі. Але, як ні дзіўна, чагосьці не стае сёлета. Так і ёсць! На дзвярах амаль не ўбачыш надпісу: «Цішэй, экзамен!». Не ведаю, ці гэта клопаты аб захаванасці маёмасці, а можа і проста пачала выходзіць з моды старая студэнцкая традыцыя, але факт застаецца фактам. Затое па-ранейшаму перад дзвярыма «экзаменацыйнай аўдыторыі» тоўпяцца балельшчыкі, якія праз колькі хвілін самі стануць змагарамі за высокую адзнаку ў залікоўцы.

Адкладзены ў бок усе ранейшыя турботы, заціхла жыццё ў камсамольскіх арганізацыях, на стэндах вісяць старыя факультэцкія насценгазеты, а на некаторых факультэтах іх зусім няма. А ў гэты жа гарачы час дапамога насценгазет дэканатам, партыйным арганізацыям факультэтаў і універсітэта асабліва неабходна. Ні на адным факультэце сёлета няма і экзаменацыйных бюлетэняў, якія расказалі б аб ходзе летняй сесіі.

І толькі бібліятэкам, чытальным залам, кабінетам прыходзіцца адказваць за ранейшыя «прастоі» ў рабоце. Цяпер яны працуюць з максімальнай нагрузкай, вытрымліваюць магутныя атакі студэнтаў як раз тых, якіх ні ў якім выпадку не ўбачыш у бібліятэцы ў звычайныя дні.

Няма спакою і штабу цаліннікаў. Чым далей у лес, тым больш дроў—кажа прымаўка. Так і ў штаба. Чым бліжэй да ад'езду, тым больш клопатаў. Трэба ж арганізаваць атрад так, каб потым не было сорамна перад равеснікамі з Уральскай вобласці.

Чацвёртакурснікі хімічнага, геаграфічнага і некаторых іншых факультэтаў даўно ўжо здалі экзамены і цяпер праходзяць вытворчую практыку. Трэці і чацвёрты курсы аддзялення журналістыкі, наадварот, толькі-толькі прыйшлі з паўгадовай практыкі ў газетах і часопісах, на радыё і ў тэлестудыях і цяпер здаюць экзамены.

Але ў асноўнай масе студэнтаў здадзены пакуль што першыя экзамены, і па іх выніках пакуль цяжка меркаваць аб якасці падрыхтоўкі універсітэта да сесіі. Аднак на фізічным факультэце, відаць, справы паляпшаюцца. Летнюю экзаменацыйную сесію, калі меркаваць па здадзеных заліках, фізічны факультэт пачаў больш удала, чым папярэднюю зімовую. Прыкладна такое ж становішча і на матэматычным факультэце.

Пачатак добры. Але ў народзе кажуць: «Канец добры — усё добра!». Пажадаем жа поспехаў на экзаменах кожнаму студэнту: «Ні пуху, ні пяра!».

**В. Налімаў.**

## Універсітэт за тыдзень

**1—7 чэрвеня 1963 г.**

*Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна аб'явіў прыём студэнтаў на наступныя факультэты дзённага і вячэрняга навучання ў 1963-64 навучальным годзе: гістарычны; філалагічны па спецыяльнасцях: беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура і журналістыка; юрыдычны; фізічны па спецыяльнасцях: а) радыёфізіка і электроніка, б) фізіка; матэматычны; біялагічны; геаграфічны; хімічны. Падрабязнасці чытайце ў наступным нумары газеты.*

◆

*Да Міжнароднага дня абароны дзяцей бібліятэка універсітэта арганізавала кніжна-ілюстратыўную выстаўку «Няхай заўсёды будзе сонца!».*

*Таксама арганізавана выстаўка выданняў твораў пісьменніцы Ольгі Форш з выпадку 90-летняга юбілея пісьменніцы.*

◆

*Днямі стала вядома, што не 250, а 300 студэнтаў Белдзяржуніверсітэта паедуць на цалінныя навабудоўлі Уральскай вобласці.*

◆

*У спаборніцтвах спартакіяды Мінска па баскетболу першынство заваявалі сярод жаночых каманд спартсменкі таварыства «Дынама». Спартсменкі «Буравесніка», сярод якіх большасць баскетбалістак універсітэта, занялі толькі чацвёртае, перадапошняе месца.*

## Фотарэпартаж

## Чэрвенскія будні



У гэтыя гарачыя чэрвенскія дні асабліва горача ў велізарнай арміі студэнтаў. Яны даюць справаздачу аб тых ведах, што атрымалі за вучэбны год. Для адных гэта першы навучальны год, для другіх — апошні.

Аўтарам гэтага фотарэпартажа з'яўляецца студэнт 4 курса хімічнага факультэта Яўген Карпінчык. І, зразумела, перш за ўсё ён хацеў бы расказаць аб сваіх факультэцкіх сябрах. Пяцікурснікі гэтага факультэта заканчваюць работу над дыпломнымі, многія з якіх маюць вялікае практычнае і тэарэтычнае значэнне, у тым ліку і работы Ані Абражэвіч і Валі Афонінай, якіх Яўген Карпінчык прадстаўляе чытачам. Будзем спадзявацца, што дзяўчатам, як кажуць студэнты, пашанцуе на абароне сваіх работ. Пажадаем ім «ні пуху, ні пяра!»...

Студэнты з В'етнама вучацца на 1 курсе фізічнага факультэта. Яны паспяхова прайшлі першы рубеж — зімовую экзаменацыйную сесію. Тады яны не мелі ніводнага «правала». Паспяхова пачалі яны і летнюю экзаменацыйную сесію. Дзве групы в'етнамскіх студэнтаў маюць па першаму экзамену (адны здавалі матэматычны аналіз, другія— аналітычную геаметрыю) толькі пяць здавальняючых адзнак. Такі поспех — вынік іх высока мэтанакіраванай калектыўнай працы. Дапамога адзін аднаму, кансультацыі выкладчыкаў, сяброўская дапамога савецкіх студэнтаў таксама адыгралі вялікую ролю ў падрыхтоўцы да экзаменаў.

*(Заканчэнне на 2 стар.)*



Верхні здымак зроблены ў лабараторыі арганічнага сінтэзу, дзе выпускніца хімічнага факультэта Аня Абражэвіч працуе над сваёй дыпломнай работай «Акісленне ненасычаных кетонаў».

На ніжнім здымку: старшы прэпаратар Павел Арыстархавіч Клімоўскі разам з пяцікурсніцай хімічнага факультэта Валяй Афонінай рыхтуе да работы ўстаноўку па атрыманню фурана з фурфурола. У Валі тэма дыпломнай — «Каталітычнае акісленне фурана».

# ТАКІМ БУДЗЕ СТУДЭНЦКАЕ ЛЕТА

Праз тры тыдні будуць прастаўлены апошнія адзнакі ў залікоўках стацыянарнікаў, сціхне экзаменацыйная гарачка. Надыйдзе час адпачынку. Але ці такі ўжо ціхі будзе гэты час? Не, далёка не!

300 студэнтаў-будаўнікоў адправяцца на новабудоўлі Зеляноўскага тэрытарыяльна-вытворчага ўпраўлення Уральскай вобласці.

У мінулым годзе група студэнтаў-хімікаў выязджала ў Крымскую вобласць на ўборку ўраджаю сельскагаспадарчых культур. А сёлета, падтрымліваючы іх пачынанне, ужо 150 студэнтаў біялагічнага, геаграфічнага, матэматычнага, філалагічнага і, зразумела, хімічнага факультэтаў будуць працаваць на ўборцы ўраджаю сельгаскультур у Бахчысарайскім і Сімферопальскім раёнах Крымскай вобласці.

Яшчэ трыста студэнтаў адпачнуць, а заадно і папрацуюць у спартыўна-аздараўленчым лагеры на возеры Нарач.

У турысцкі паход па Паміры накіруюцца 40 чалавек, на Каўказе пабываюць яшчэ 100 чалавек.

60 студэнтаў пабываюць у дамах адпачынку рэспублікі. А 50 чалавек з'ездзяць на экскурсію ў горад на Няве — Ленінград.

250 студэнтаў універсітэта ўжо працуюць, альбо будуць працаваць піянерважатымі ў піянерскіх лагерах рэспублікі.

Акрамя таго, у час летніх канікул будзе працягвацца будаўніцтва студэнцкага універсітэцкага стадыёна. Кожны студэнт аддасць яму працоўны тыдзень. І яшчэ адну справу будуць выконваць студэнты БДУ ў час канікул. На прадпрыемствах, у калгасах, саўгасах, ва ўстановах кожны з іх прачытае 1—2 лекцыі аб сваёй ВНУ — Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна.

# Вершы Святланы Харлан

*Два гады назад філалагічны факультэт скончыла маладая паэтэса Святлана Харлан з Мінішчыны. Цяпер яна працуе ў польскім горадзе Беластоку. Яе вершы заўсёды вызначаліся задушэўным лірызмам. Але сёння Святлана выступае ў новым амплуа — піша вершы для самых маленькіх. Прачытайце, калі ласка, іх.*

## Дожджык

Дожджык, дожджык, секані,
Градкі школьныя палі.
Мы іх ускапалі,
Кветачкі саджалі:
Цюльпаны, ірысы,
Браткі і нарцысы.
Хай падрастаюць,
Хай расцвітаюць!
Зелена, вясёла
Будзе каля школы.
Мацней, дождджык секані,
Зямлю добра напаі.

## Галінка

Галінка такая,
Як іншыя дзеці:
Нічога яна
Не баіцца на свеце:
Ні чорта з бабулінай казкі, ні ночы —
Не ведаюць страху Галінчыны вочы.
Заўсёды вясёлыя і прыгожыя,
Не бачылі смерці ад кулі варожай,
Пажараў чырвоных і чорнага неба,
Не бачылі чэрствага, цвілага хлеба.
Як добра, што вочы смяюцца ў дзяўчынкі,
Што ў небе блакітным — ніводнай хмурынкі!
Як добра б было, каб ніколі на свеце,
Не ведалі жахаў вайны нашы дзеці!

## Як Рыгорка рэха шукаў

Крыкнуў Рыгорка ў бочку пустую —
І ў адказ тое ж самае чуе.
Песню запеў — хтось Рыгорку крыўляе.
Міг — і Рыгорка ў бочку шмыгае.
Мацае дно — не знаходзіць нічога.
«Мо' пачакаць?»... Сон кранае малога.
Спіць і не чуе, як бразгае брама,
Як па двары ідзе з вёдрамі мама.
Выліла ў бочку вады вядзёрка —
«Ай-яй-яй!» — Мокры ўскочыў Рыгорка.
Цягне сыночка матуля са смехам:
«Што ты рабіў там?» — «Шукаў, мама, рэха»

# Чэрвенскія будні

(Пачатак на 1 стар.)

...У гэтыя дні студэнтаў можна ўбачыць усюды. Адны прывыклі займацца ў ценю дрэў, другія на беразе Мінскага мора, трэція... дарэчы, паглядзіце здымак уверсе, зроблены ў чыталцы, трэція запаўняюць аўдыторыі, кабінеты, лабараторыі, чытальныя залы, не пакідаючы ніводнага свабоднага крэсла. А як бы хацелася, каб не толькі ў чэрвенскія, а і ў лютаўскія, сакавіцкія і іншыя дні студэнты прыходзілі займацца сюды, не спадзеючыся на чэрвенскі штурм.



На ніжнім здымку: студэнт 4 курса фізічнага факультэта Іосіф Калевіч дапамагае в'етнамскім студэнтам Дам Бінь Тханю і Нгуен Нгок Лонгу рыхтавацца да экзамена.



## Чайнворд „Студенческий"




1. Высшее учебное заведение. 2. Массовый вид спорта, которым увлекаются студенты. 3. Преподаватель-специалист. 4. Спортивное объединение. 5. Студенческое спортивное общество. 6. Член молодежной организации. 7. Участник освоения казахстанских степей. 8. Преподаватель, закрепленный за академической группой студентов. 9. Руководитель высшего учебного заведения. 10. Общественная проверка. 11. Руководство факультета. 12. Истина, требующая доказательства. 13. Студенческая опера. 14. Письменная работа. 15. Распространенный среди студентов вид спорта. 16 Денежное пособие студента. 17. Специалист-филолог. 18. Аргументация, обоснование фактами. 19. Второй родной дом студента.

Составил Е. КУЛАГИН.

# Фізкультура і СПОРТ

## З СУДЕЙСКІХ ПРАТАКОЛАЎ ПЕРШЫНСТВА ВНУ РЭСПУБЛІКІ ПА ЛЁГКАЙ АТЛЕТЫЦЫ

У выніку трохдзённай барацьбы ў першай групе студэнцкіх калектываў фізкультуры перамаглі спартсмены ІФК, а іх галоўны канкурэнт — каманда нашага універсітэта заняла другое месца, абыйшоўшы трэцяга прызёра амаль на 6 тысяч ачкоў.

Вось некаторыя вынікі спартсменаў БДУ ў гэтых спаборніцтвах.

В. Калеснікаў прабег 100 метраў за 11,0 секунды. А. Папоў перамог у бегу на 5000 метраў — 14 мінут 54,0 секунды. Ён заняў таксама другое месца ў бегу на 10000 метраў, паказаўшы роўны час з пераможцам — студэнтам ІФК Я. Іучанкам — 31 мінута 59,2 секунды.

Бег на 3000 метраў з перашкодамі выйграў студэнт гістфака БДУ М. Базылеў. А. Котаў і І. Бакуновіч у спартыўнай хадзьбе на 20 кіламетраў фінішавалі амаль адначасова. Аднак першым стаў Альберт Котаў.

Г. Саўчанка перамагла ў пяціборстве з сумай 3791 ачко.

За рэдактара Я. ЛЯХАЎ.

Адрас рэдакцыі:
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 03897 Тыр. 2000 Зак. 2135.